# ГАЛІНА АСМАЛОЎСКАЯ:
## «Мандаліна — значная частка нашага мінулага»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У час канферэнцыі давялося пагутарыць з ініцыятарам і арганізатарам гэтай падзеі, чалавекам, адданым сваёй справе, прэзідэнтам Асацыяцыі беларускіх дамрыстаў і мандаліністаў (АБДМ), заслужанай артысткай РБ, прафесарам Г. Асмалоўскай.

*— Галіна Віктараўна, скажыце, калі ласка, як узьнікла ідэя адраджэньня мандаліны? Чаму вы вырашылі займацца менавіта гэтай справай?*

— Гісторыя Беларусі, яе культура мінулых часоў усё больш цікавяць сучасьнікаў. І гэта заканамерны працэс для краін, якія аб'явілі сваю незалежнасьць. Менавіта таму зараз узрастае цікавасьць да мандаліны, што гэта значная частка нашага мінулага. Дзякуючы нашым дасьледчыкам-музыказнаўцам І. Назінай, В. Дадзіёмавай, Т. Якіменка і інш. мы зараз можам канстатаваць, што культурнае жыцьцё нашых продкаў было духоўна багатым і насычаным. Тым не менш у гісторыі народнаінструментальнага жанру яшчэ шмат «белых плям». І гэта прывяло да таго, што многія традыцыі ўжо зьнікаюць, як, напрыклад, гэта здарылася з мандалінай. І наш грамадзянскі абавязак — не даць загінуць культурным традыцыям продкаў. Інакш што застанецца нашым нашчадкам, якая спадчына? Культурная пустэча і бездухоўе?..

*— Так, вы маеце рацыю. Але вернемся да мандаліны. Што гэта за інструмент і як ён трапіў на тэрыторыю Беларусі?*

— Мандаліна, як і скрыпка, прыйшла да нас з Італіі. Лічыцца, што гэты інструмент падобны на лютню. Яшчэ больш падобны на лютню блізкі да яе сваяк — пазьнейшы інструмент мандола. Калі ў 17-ым ст. зьявілася мандаліна, мандола ператварылася ў адну з аркестравых разнавіднасьцяў — тэнаровую мандаліну. Пачынаючы з 17-га ст., мандаліна хутка распаўсюджваецца па Італіі і становіцца там народным інструментам. У 18-ым ст. яна была ўжо добра вядома ва ўсіх краінах Еўропы, а ў 19-ым — 20-ым ст. — на ўсіх кантынентах. Існуе шэраг розных па форме корпуса і колькасьці струн мандалін: неапалітанская (выпуклая, авальная), партугальская (напалову авальная), нямецкая (плоская), фларэнтыйская, генуэзская, падуанская і інш. На тэрыторыі Беларусі сустракаліся розныя мандаліны: неапалітанская, партугальская, нямецкая, але дагэтуль невядомы шлях, па якім ішло распаўсюджаньне мандаліны на беларускіх землях. Вядома толькі тое, што тамбуравідныя інструменты існавалі тут многія стагоддзі. Лютня, напрыклад, была распаўсюджана на Беларусі ў 16-ым — 17-ым стст.

*— Мандаліна на Беларусі... Ці магчыма гэта зараз, калі, нарэшце, пачала ажыцьцяўляцца праграма адраджэньня беларускай мовы, беларускай нацыянальнай культуры? Калі чуюцца галасы, што ў нашым культурным жыцьці не павінна быць месца такім масавым інструментам, як домра і балалайка, таму што яны, быццам, маюць «замежнае», а дакладней, рускае паходжаньне? А тут зусім ужо «замежны» інструмент — мандаліна. Ці не плывяце вы супраць цячэньня?*

— Я зразумела вас. У такім разе давайце зьвернемся да гісторыі разьвіцьця некаторых іншых інструментаў. Возьмем, напрыклад, скрыпку. Без гэтай царыцы інструментаў мы не можам нават уявіць сабе сучаснага музычнага жыцьця. Тым не менш вядома, што ў 16-ым — 17-ым стст. ішла барацьба за сцьвярджэньне скрыпкі і віяланчэлі. У многіх трактатах таго часу скрыпку называлі «нешляхетным» інструментам прастадюдзінаў.

*— Цяжка ўявіць, што гэты акадэмічны інструмент калісьці забаранялі. Напэўна, пасьля таго, што для скрыпкі зрабіў Паганіні, яе лёс быў канчаткова вырашаны, таму што менавіта выканаўцы ўздымаюць той ці іншы інструмент на новую вышыню.*

— Гэта сапраўды так. Што датычыцца домры, то тут мы назіраем аналагічную карціну, мабыць, толькі больш трагічную. Вучоныя, сярод якіх значная роля належыць М. Імханіцкаму, даказалі, што інструменты, падобныя на домру (іншаземцы называлі іх лютнямі, расіяне — домрамі), існавалі на тэрыторыі Усходняй Еўропы з 10-га ст, і невядома, якім бы быў шлях домры, каб не 1648 г., калі цар Аляксей Міхайлавіч загадаў зьнішчыць усе інструменты скамарохаў («кабацкія, д'ябальскія, гудзебныя сасуды»). Так званыя скамарошныя інструменты былі забаронены пад пагрозай сьмерці. Амаль 250 гадоў пасьля царскага ўказа не было ніводнага ўпамінаньня пра домру. І толькі ў 1896 годзе В. Андрэеў сумесна з майстрам Пасербскім, не маючы ніякіх зьвестак аб старажытным інструменце, сканструявалі 3-струнную домру.

*— Нібы ў лабараторных умовах?*

— Бадай што так. Нанава створаны інструмент пачаў распаўсюджвацца па ўсёй тэрыторыі Расіі, у тым ліку і ў Паўночна-Заходнім краі, г. зн. у Беларусі. Такім чынам інструмент, якому няма яшчэ 100 гадоў, стаў масавым у Расіі, у Беларусі, а таксама на Украіне. І сёньня майстэрства дамрыстаў дасягнула такой ступені, што мы з поўным правам можам гаварыць пра існаваньне акадэмічнай галіны ў выканальніцтве на гэтым інструменце...

Гутарыла Ларыса Таірава.

Фота С. Бурава.



**Удзельнік канферэнцыі — фальклорны ансамбль Наваполацкага музычнага вучылішча «Талака».**

**Дуэт дамрыстак. Ала Сакалоўская і Ала Шоман. (За фартэпіяна Вольга Карасёва).**